Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2013 г.

## Мерапрыемствы да Дня ведаў і беларускага пісьменства і друку

**1 верасня** У форме медыапрэзентацыі «Вначале было слово…» прайшло знаемства малодшых школьнікаў Астроміцкай школы з вытокамі стварэння славянскай азбукі і яе стваральнікамі.

(Астроміцкая СБ, 34 чал)

**2 верасня** Дзень ведаў “Як ты сэрцу майму міла, дарагая Беларусь” прайшоў у дзіцячай бібліятэцы. Вучні сярэдняй школы №1г. Кобрына адправіліся ў падарожжа па роднаму краю з кнігай Е.М.Мяшэчка «Путешествие по Беларуси”. «У краю Нёмана, Заходняга Буга і Прыпяці».

(Дзіцячая бібліятэка, 43 чал)

**2 верасня** У чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі адбыўся Дзень ведаў “Як ты сэрдцу майму міла, дарагая Беларусь”

У праграме:
-відэаролік “Радзіма мая дарагая”;
-відэапрэзентацыя “Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь, геральдычныя сімвалы Кобрына і Кобрынскага раёна»;
-відэапрэзентацыя «Летопись праздника Дней белорусской письменности».

У гэты дзень бібліятэку наведалі вучні Імянінской сельскай школы і навучэнцы гімназіі г.Кобрына, яны прынялі актыўны ўдзел у першым уроку новага навучальнага году.

(Цэнтральная бібліятэка, 80 чал.)

## Мерапрыемствы ў рамках міжнароднай культурнай акцыі «Жывая спадчына - повязь часоў»

**28 верасня** Дзіцячая бібліятэка правяла Дзень беларускай казкі “Казка родная, народная”
-прэзентацыя кніжнай выставы “Да нас у госці казка завітала”;
-выступленне лялечнага тэатра: беларуская народная казка “Лёгкі хлеб”;
-Віктарына-эстафета па беларускіх народных казках “Казкі водзяць карагод”;
-Конкурс дзіцячых малюнкаў “Казачныя акварэлькі”

(Дзіцячая бібліятэка, 72 чал.)

**29 верасня** У цэнтральнай бібліятэцы прайшло свята беларускай мовы “Душа народа – у родным слове”

У праграме:
-адкрыты прагляд літаратуры “Беларусь і культурная Памяць Еўропы”;
-выступленне ЛПГ “Ен любіў усе колеры жыцця…” (Да 100 годдзя з дня нараджэння С.Грахоўскага);
-сустрэча з літаратарамі-землякамі Кобрыншчыны А.Паплаўскім і Л.Валасюком;

(Цэнтральная бібліятэка, 80 чал)

**Мерапрыемствы да Дня бібліятэк**

**15 верасня** Дзівінская СБ святкавала свой 65-гадовы юбілей пад назвай "Юбілейны бенефіс"
На мерапрыемстве прысутнічалі ўсе бібліятэкары, якія калісьці працавалі ў бібліятэцы. Чытачы арганізавалі "Стол падарункаў" для сваіх бібліятэкараў. Для гасцей была падрыхтавана віншавальная праграма з конкурсамі, медыавіктарынай, гульнямі і музычнымі віншаваннямі.

(Дзівінская СБ, 86 чал.)
(Кобрынскі веснік, - 2013.- 21 верасня – с.12)

**15 верасня** У чытальнай зале Цэнтральнай бібліятэкі адбыўся свабодны мікрафон "І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай".
Да мерапрыемства бібліятэка выдала зборнік вершаў мясцовай паэтэсы Наталлі Цярэнцьевай "Открываю мыслями небо…", прэзентацыя якога адбылася на мерапрыемстве, усе жадаючыя маглі набыць зборнік з аўтографам аўтара.
Паэты і барды літаратурнага аб'яднання «Белый аист» і аматарскага клуба"Встреча" чыталі свае вершы.
На працягу некалькіх часоў жадаючыя дзяліліся сваёй творчасцю ля"свабоднага мікрафона"

(Цэнтральная бібліятэка, 75 чал.)
(Кобрин-информ. – 2013. – 19 сентября с.4)

**Мерапрыемствы ў рамках тыдня рэкламы "Бібліятэка ў новым тысячагоддзі"**

**3 верасня** Стрыгаўская СБ правяла Дзень самакіравання «Я сегодня библиотекарь»
Дзеці рэкламавалі навінкі літаратуры ўсім карыстальнікам бібліятэкі. Ля фотавыставы «Былое, вечнае, мінулае», прысвечанай гісторыі вёскі Стрыгава, юныя бібліятэкары правялі агляд фотаздымкаў для сваіх родных, сяброў, суседзяў.

(Стрыгаўская СБ, 70 чал.)

**8 верасня** Літаратурная гадзіна «Когда шелестят страницы» прайшла ў форме віктарыны. Знаўцы літаратуры дэманстравалі свае веды па сучаснай беларускай літаратуры.

(Тэвельская СБ, 18 чал.)

**10 верасня** Дзень адчыненых дзвярэй «Каждому человеку путь открыт в библиотеку».
У праграме дня:
-займальная экскурсія па залах бібліятэкі;
-\прагляд лялечнага спектакля "Зайка-Хваста";
-інфармацыйны агляд «Экономия и бережливость в нашей жизни».
У гэты дзень мерапрыемствы бібліятэкі наведалі вучні школы №6, №7, №1 г. Кобрына.

(Дзіцячая бібліятэка, 130 чал.)

**11 верасня** Дзівінская сельская дзіцячая бібліятэка правяла бібліягід "Твая вялікасць – Бібліятэка"
У праграме:
-экскурсія па бібліятэцы;
-знаёмства з гісторыяй бібліятэкі;
-агляд навінак літаратуры.
У заключэнні мерапрыемства, прысутным прапанавалі віктарыну "Што мы ведаем пра кнігу".

(Дзівінская СДБ, 35 чал.)

**11 верасня** Дзень чытацкага самакіравання «Читательские шалости». У ролі бібліятэкара выступіла вучаніца 10 класа Астроміцкай школы Свіржэўская Марыя, яна абслугоўвала наведвальнікаў, прапанавала навінкі прэсы. Падлеткі арганізавалі буккросінг з уласных кніг
«Книга из рук в руки».

(Астроміцкая СБ, 17 чал.)

**21 верасня** У Гарадзецкай СБ адбыўся дзень адчыненых дзвярэй «Всей семьёй в библиотеку».

Чытаючыя сем'і вёскі ўдзельнічалі ў віктарынах і конкурсах, чыталі вершы любімых паэтаў. Пераможцы конкурсаў і віктарын ўзнагароджваліся граматамі і музыкальнымі падарункамі ў выкананні гурта«Алёнка» Гарадзецкага СК.

(Гарадзецкая СБ, 23 чал.)

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**21 верасня** Залеская СБ у рамках свята вёскі «Деревня моя с тобой навеки связан я!» , прысвечанага 450 годдзю вёскі Залессе, правяла ўшанаванне сваіх лепшых чытачоў у 9 намінацыях. Да мерапрыемства бібліятэка распрацавала буклет "Залессю – 450" па гісторыі вёскі, які быў ўручаны прысутным на свяце.

(Залеская СБ, каля 150 чал.)

**23 верасня** У рамках свята вуліц «Любимый сердцу уголок» вёскі Лелікава Лелікаўская СБ ушаноўвала сваіх лепшых чытачоў у сямі намінацыях.

(Лелікаўская СБ, 120 чал.)

Гал. бібліятэкар АБМ Іванова І.
2-36-81